ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел бібліятэказнаўства

БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА. ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

Вып. 3–4

Віцебск
2013

УДК 027
ББК 78.34(4Беи-4Вит)
Б67

Складальнік *В. М. Нявейкава*
Рэдакцыйная калегія:
Т. М. Адамян (адказ. рэд.), А. М. Васілеўская
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

На вокладцы: царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў г. Докшыцы (пач. XX ст.).

Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён : інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. В. М. Нявейкава]. — Віцебск, 2013. — 45 с. : іл.

У штоквартальным выданні «Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён» прадстаўлены артыкулы кіраўнікоў і спецыялістаў Докшыцкай, Дубровенскай, Полацкай раённых і Наваполацкай гарадской сетак публічных бібліятэк.

Выданне прызначана для бібліятэчных работнікаў, спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій, кіраўнікоў органаў кіравання культурай, а таксама для тых, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы ў Віцебскай вобласці.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2013

ЗМЕСТ

ГОСЦЬ НУМАРА

Ірына Вячаславаўна Карэпанава
БІБЛІЯТЭКІ ДОКШЫЧЧЫНЫ: СУЧАСНАЕ……5

Валянціна Мікалаеўна Шаура
НАША ЗАДАЧА – АДПАВЯДАЦЬ ЧАСУ……..…..8

Ала Сямёнаўна Закалінская
«ДАКШЫЧАНКА»: З ВОПЫТУ РАБОТЫ КЛУБА ПА ІНТАРЭСАХ……13

Алена Уладзіміраўна Гудзь
ЧАС ПАДВОДЗІЦЬ ВЫНІКІ: РАБОТА ДОКШЫЦКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ ПА ПРАГРАМЕ «ЛУЧ»……..17

Наталля Мікалаеўна Фарэйтарава
БІБЛІЯТЭКІ ДУБРОВЕНСКАГА РАЁНА: ВОПЫТ. ПРАБЛЕМЫ. ПОШУК……..20

Надзея Аляксандраўна Дударава
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭЧНАГА МАРКЕТЫНГУ – ЦЭНТР БІБЛІЯТЭЧНАЙ ІНАВАТЫКІ…….24

Тацяна Мікалаеўна Букаткіна
ДОМ ВОКНАМІ Ў ДЗЯЦІНСТВА: РАБОТА ДУБРОВЕНСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ……..…….27

Ірына Мікалаеўна Масейка
САДОЎНІКАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА: НАРОДНЫ КЛУБ «СУБЯСЕДНІЦА».....31

КОНКУРС

Галина Николаевна Нелина
ЧЕЛОВЕК МЕДИЙНЫЙ РОЖДАЕТСЯ В БИБЛИОТЕКЕ……..38

Людмила Николаевна Русакова
ДЕТСКАЯ БИБЛИОТЕКА: НОВЫЕ ИДЕИ И ПОДХОДЫ……..42

ГОСЦЬ НУМАРА

Кароткая даведка

Докшыцкі раён, на паўднёвым захадзе Віцебскай вобласці. Плошча 2,2 тыс. км². Мяжуе з Лепельскім, Пастаўскім, Глыбоцкім, Ушацкім раёнамі і Мінскай вобласцю. Утвораны ў 1940 годзе. Насельніцтва – каля 25 тыс. чалавек. У складзе раёна горад Докшыцы (насельніцтва – 6,8 тыс. чалавек), гарадскі паёлак Бегомль (насельніцтва 2,7 тыс. чалавек), 270 населеных пунктаў. Цэнтр – горад Докшыцы, размешчаны ў 200 км ад г. Віцебска і 150 км ад г. Мінска. Першыя звесткі аб горадзе знойдзены ў грамаце вялікага князя Вітаўта (1407 г.). Бярэзінскі біясферны запаведнік, які размяшчаецца на тэрыторыі раёна, займае звыш 40,2 тыс. га. Лясы складаюць звыш 49 % тэрыторыі раёна. Вядучая галіна народнагаспадарчага комплексу – сельская гаспадарка.

Знакамітыя людзі раёна: кампазітар Н. Сакалоўскі, мастакі В. Маркавец і Н. Хадасевіч-Лежэ, паэты і пісьменнікі А. Ставер, Ю. Свірка, І. Стадольнік і інш. На Докшыччыне жыў і вучыўся ў мясцовай школе П. Панчанка. Дзед Прэзідэнта Украіны В. Януковіча – ураджэнец раёна.

Герб г. Докшыцы: у зялёным полі французскага шчыта – два чорных узгоркі, на іх размешчаны залатыя пасудзіны, з якіх выліваюцца крыніцы срэбнага колеру, накіраваныя ў розныя бакі верхняй часткі шчыта. Пасудзіны і срэбныя крыніцы пазначаюць месца, дзе бяруць рэкі Вілія і Бярэзіна, славутыя тым, што спрыялі гандлю на берагах Чорнага і Балтыйскага мораў.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА.
ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

Вып. 3–4

Складальнік **Нявейкава** Вольга Макараўна
Адказны за выпуск А. І. Сёмкін
Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай
Мастацкае афармленне Ж. Ю. Масько

Тыраж 10 экз.
Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601 г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: vlib@vlib.by

это время состоялось немало интересных встреч, на которых ребята всегда узнавали что-то новое, с удовольствием принимали участие в играх, викторинах. Сотрудники библиотеки не раз посещали различные городские мероприятия, где знакомились с работами ребят из ОДПИ.

Новым этапом в этом сотрудничестве стал совместный арт-проект «Сказка своими руками», который начал осуществляться с июня 2013 года. Цель проекта – помочь ребятам из ОДПИ наиболее полно раскрыть свои способности и таланты, представить свои работы публике, ведь каждая их работа – это способ выразить свои мысли, чувства и ощущения, а желание поделиться ими с другими свойственно любому творческому человеку. В рамках проекта в библиотеке планируется провести серию выставок творческих работ людей с ограниченными возможностями. Две из них уже состоялись.

На первой выставке были представлены творческие работы Виталия Моисеева. Молодой человек занимается лепкой. Посетители библиотеки с удовольствием рассматривали его работы, выражали свое восхищение и оставляли пожелания в книге отзывов.

В октябре прошла вторая выставка работ воспитанников отделения дневного пребывания для инвалидов. Картины и поделки (в основном коллективные работы) удивляли посетителей необычайным изяществом, вызывали ощущение теплоты и создавали хорошее настроение. Для работы молодые люди использовали различные материалы: бисер и пайетки, нитки и тесьму, кожу и ткань, пластилин, а также природный материал и т. д.

Инновации в библиотеке с удовольствием были приняты ее читателями, имели резонанс в городе, получили положительную оценку в области и еще раз доказали, что библиотека и в век высоких технологий все также востребована, вселили в ее сотрудников желание искать и использовать в своей работе другие новые, необычные, интересные формы библиотечной работы.

Ірына Вячаславаўна Карэпанава,
дырэктар Докшыцкай сеткі публічных бібліятэк

БІБЛІЯТЭКІ ДОКШЫЧЧЫНЫ: СУЧАСНАЕ

Паважаныя калегі!

Я вітаю вас на старонках «Бібліятэчнай прасторы» ад імя работнікаў Докшыцкай сеткі бібліятэк.

Бібліятэка, як чысты выток і старажытная скарбніца мудрасці, дае магчымасць дакрануцца да сапраўдных ведаў, зберагчы для нашчадкаў тую ніць, якая звязвае з мінулым, дае ўпэўнены арыенцір на будучае.

Па стану на 01.01.2013 года бібліятэчным абслугоўваннем насельніцтва нашага раёна займалася 33 бібліятэкі, у сельскай мясцовасці – 30, з іх 4 бібліятэкі-клубы, за 9 месяцаў 2013 года 2 бібліятэкі рэарганізаваны ў бібліятэкі-клубы (Юркаўшчынская і Станіслаўская), на базе Замастоцкай і Вітуніцкай створаны інтэграваныя бібліятэкі, Варганская бібліятэка-клуб і Янушэўская сельская бібліятэка закрыты. На сённяшні дзень абслугоўваннем займаецца 31 бібліятэка.

Бібліятэчнымі паслугамі карыстаюцца звыш 16 тысяч чытачоў (65 % насельніцтва), кнігавыдача складае больш за 300 тысяч экзэмпляраў у год, колькасць наведванняў – каля 130 тысяч.

Кніжный фонд ЦБС на 01.01.2013 года склаў 312 436 экзэмпляраў кніг і перыядычных выданняў. За 9 месяцаў 2013 года бібліятэчны фонд папоўніўся на 11 806 адзінак.

Камп'ютарызацыя бібліятэк дазваляе нашым установам выйсці на новы ўзровень абслугоўвання карыстальнікаў. Камп'ютарызавана 13 бібліятэк, доступ у інтэрнэт маюць 9 бібліятэк.

У сістэме працуюць 5 ПЦПІ: у цэнтральнай раённай бібліятэцы, Бягомльскай гарпасялковай, Порплішчанскай, Сітцаўскай і Крулеўшчынскай сельскіх бібліятэках. Кожны карыстальнік мае магчымасць доступу да прававога банка даных «Эталон», нарматыўных дакументаў, як у электронным выглядзе, так і на папяровых носьбітах. Акрамя гэтага, традыцыйным стала правядзенне мерапрыемстваў з удзелам спецыялістаў юрыдычных прафесій.

Бібліятэкі актыўна ўдзельнічаюць у рэалізацыі рэспубліканскіх і абласных праграм, а таксама вядуць работу па ўкараненні ўласных. Сярод іх: «Бацькаўшчына светлая мая», якая накіравана на вывучэнне, захаванне і прапаганду беларускай нацыянальнай спадчыны, выхаванне нацыянальнай самасвядомасці, павагі і гонару за гістарычную і культурную спадчыну краіны, адраджэнне лепшых культурных традыцый, інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне па пытаннях нацыянальнай культуры. Мэта праграмы «Посвет памяці нашай» – папулярызацыя літаратуры гісторыка-патрыятычнай тэматыкі, развіццё гісторыка-патрыятычнай свядомасці; экалагічнай праграмы «Зямля – наш дом» – фарміраванне ў чытачоў комплекснай сістэмы ведаў аб асновах экалогіі, папулярызацыя літаратуры экалагічнай тэматыкі. Прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем пажылых людзей, ветэранаў вайны і працы, людзей з абмежаванымі магчымасцямі, раскрыццё іх талентаў і здольнасцей – гэта задачы праграмы «Сіла мудрасці – маладосць душы»; стварэнню спрыяльных умоў для рэалізацыі прынцыпаў здаровага ладу жыцця і свядомай адмове ад шкодных звычак садзейнічае мэтавая праграма «Здароўе – жыцця ключы». Падчас летніх канікул дзіцячая раённая бібліятэка працавала па праграме летняга чытання «Лета. Чытач. Кніга», а цэнтральная раённая – па мэтавай праграме «Моладзь і кніга», якая накіравана на выхаванне культуры чытання.

инновационные формы массовой работы: акция «Читай, я буду слушать», арт-проект «Сказка своими руками» и литературная игра «Книжные жмурки». Авторами этих инноваций стали заведующая библиотекой Елена Александровна Манцевич и библиотекари абонемента Татьяна Валерьевна Воронец и Наталья Ивановна Ефремова.

Акция «Читай, я буду слушать!» стартовала в Неделю детской и юношеской книги в детской поликлинике города. Ее целью было не только развлечение маленьких пациентов, но и реклама библиотеки, привлечение новых читателей. Участниками акции стали дети, ожидающие приема у врача, которым библиотекари читали сказки, рассказы, стихи, загадывали загадки. Идею с удовольствием поддержала администрация учреждения и с радостью согласилась сотрудничать. Поэтому в первый день лета библиотекари вновь посетили поликлинику, где в кабинете лечебной физкультуры провели с ребятами игровую программу и громкие чтения «Здравствуй, лето!», посвященные здоровому образу жизни.

Во время весенних каникул на абонементе библиотеки детям было предложено принять участие в еще одном необычном мероприятии – литературной игре «Книжные жмурки». Книги были завернуты в яркие разноцветные обложки. На обложке указывалось только то, для какой возрастной группы читателей предназначена данная книга. Сюрприз знакомства с книгой ожидал ребенка позже, по возвращении домой. Затея очень понравилась ребятам, книги мгновенно разошлись «по домам». Цель игры – заинтересовать читателей лучшими произведениями мировой литературы, не входящими в список обязательных к прочтению в рамках школьной программы, полностью оправдала себя.

С 2011 года библиотека сотрудничает с отделением дневного пребывания для инвалидов (ОДПИ) ГУ «Новополоцкий территориальный центр социального обслуживания населения» г. Новополоцка. В центре ребята занимаются в разнообразных кружках художественно-декоративного творчества: работают с глиной, пластилином, тестом. За

Людмила Николаевна Русакова,
главный библиотекарь отдела библиотечного маркетинга
Новополоцкой центральной городской библиотеки им.
В. В. Маяковского

ДЕТСКАЯ БИБЛИОТЕКА: НОВЫЕ ИДЕИ И ПОДХОДЫ

Участие в профессиональных конкурсах для библиотек Новополоцкой ЦБС уже давно стало традицией. Вот и в этом году две библиотеки системы (библиотека им. В. Короткевича и детская библиотека им. А. С. Пушкина) приняли участие в областном конкурсе «Инновации в работе библиотек-2013». Диплом победителя в номинации «Детская библиотека» получила детская библиотека – филиал № 4 им. А. С. Пушкина.

Впервые эта библиотека распахнула свои двери для детского читателя в 1978 году. В 1985 году ей было присвоено имя Александра Сергеевича Пушкина. Книжный фонд библиотеки на сегодняшний день составляет более 57 тысяч экземпляров документов, 3,5 тысячи юных новополочан являются ее читателями. Сотрудники библиотеки стараются разнообразить традиционные формы библиотечной работы. В 2013 году в библиотеке были апробированы три принципиально новые,

Дзейнасць бібліятэк па арганізацыі вольнага часу разнапланавая і разнастайная. Працуюць 29 аматарскіх аб’яднанняў (для дзяцей – 17, для людзей сталага ўзросту – 5, для жанчын – 6, для мужчын – 1).

Стаў добрай традыцыяй удзел бібліятэк у гарадскіх і раённых святах, менавіта гэта падштурхнула на стварэнне праекта «Бібліятэка па-за сценамі», які ў 2011 годзе быў адзначаны на абласным конкурсе «Інавацыі ў рабоце бібліятэк».

Творчы пошук, захапленне сваёй справай, працаздольнасць, адказнасць – характэрныя рысы работнікаў бібліятэк. У бібліятэчнай сістэме працуюць 56 бібліятэчных работнікаў, 40 з іх маюць спецыяльную адукацыю.

Валянціна Мікалаеўна Шаура,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу
Докшыцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі

НАША ЗАДАЧА – АДПАВЯДАЦЬ ЧАСУ

Роля сучаснай бібліятэкі ў грамадстве ўзрастае, а разам з гэтым узрастаюць і патрабаванні да метадычнай службы, бо ў першую чаргу яна забяспечвае рух бібліятэк наперад. Аддзел бібліятэчнага маркетынгу аналізуе, кардынуе, накіроўвае дзейнасць усіх бібліятэк сістэмы, аказвае метадычную і практычную дапамогу. У нашым аддзеле працуе 5 чалавек: загадчык аддзела, два метадысты, бібліятэкар і мастак-афарміцель. Усе маюць вышэйшую адукацыю.

Прафесійнай адукацыі садзейнічае выстава-панарама «Палітра бібліятэчнага жыцця», якая пастаянна дзейнічае ў аддзеле. На ёй прадстаўлены метадычныя матэрыялы ў дапамогу прафесійнай дзейнасці, сцэнарыі масавых мерапрыемстваў, тэматычныя буклеты, работы бібліятэк-пераможцаў у разнастайных конкурсах.

Вялікая ўвага надаецца вучобе кадраў, якую ажыццяўляе наш аддзел. Самай эфектыўнай формай павышэння кваліфікацыі лічым семінары. Аптымальна ў год праводзіць два семінары і пяць-шэсць вытворчых нарад. Тэмы для семінараў выбіраем найбольш актуальныя. Апошнімі семінарамі сталі «Бібліятэка ў сацыяльнай структуры аграгарадка» і «Роля і месца праваслаўнай кнігі ў нашым жыцці». У

«Человек медийный», представляющий нашу работу по программе. Фильмы выложены в YouTube, Одноклассниках, Фейсбуке, их может посмотреть любой пользователь интернета.

Чем же интересны наши необычные путешествия? Как можно путешествовать виртуально? Каждая поездка – новая страна. Что можно узнать, например, о Норвегии… Это страна радуг и фьордов, сказочного северного сияния, бережно сохраняемой природы и скромных людей. Подтверждение этому – на большом экране в фильмах и фотографиях. Но Норвегия – это еще и страна романтического композитора Эдварда Грига, неистового художника Эдварда Мунка. Норвегия – родина музыкантов, играющих жесткий викинг-рок, лучших в мире лыжников, биатлонистов и конькобежцев. Вот так, о каждой стране мы узнаем что-то новое…

Путешествуя по странам таким необычным способом, приходится совершенствоваться технически. Информационные технологии постоянно совершенствуются. С их появлением растут и ожидания наших читателей-пользователей: они хотят получать больше информации от своей публичной библиотеки и предполагать, что эти предложения будут им понятны и интересны. Технологии Web 2.0 предоставляют нам возможности для этого. Мы привлекаем этим читателей, стимулируем их посещать библиотеку, как в реальном, так и в виртуальном пространстве.

Сезон виртуальных путешествий «Зима–Весна 2013» закончился интересной встречей, познавательными и душевными разговорами, призами и подарками. Прошло лето – время отпусков, и в сентябре начался новый сезон под названием «Виртуальные путешествия: в гости к старым друзьям». Это значит, что мы будем путешествовать по странам – бывшим республикам Советского Союза. А завершится второй сезон путешествий виртуальной встречей Нового года, встречей on-line.

стало проведение мероприятий цикла «Виртуальные путешествия по Европе». На такую экскурсию в конференц-зале библиотеки собираются люди каждую субботу. Заранее, в среду или четверг через социальные сети оповещается о мероприятии, рассылаются приглашения. Ядром нашей дружной команды путешественников стали люди, прошедшие обучение на компьютерных тренингах в библиотеке.

Первой страной и городом, которые мы посетили, были Италия и Рим. Присутствующие познакомились с достопримечательностями, погуляли по Вечному городу, глядя на него глазами молодой девушки, смотрели фотографии, небольшие видео. Потом было представлено фотосочинение, посвященное юбилею фильма «Римские каникулы». Сочинение было интересно тем, что сравнивался Рим времени съемок фильма и Рим современный. Одно и то же место рассматривалось как бы сквозь призму времени, что изменилось, что осталось прежним.

Дальше, путешествуя по субботам, мы посетили: Испанию, Францию, Чехию, Латвию, Германию, Великобританию, Швецию и другие европейские страны. Материалы для путешествия библиографы Галина Николаевна Нелина и Екатерина Александровна Тимофеева подбирают в интернете, используя технологии Web 2: блоги, Youtube. А потом осуществляется обратная связь: материалы прошедшего виртуального путешествия выставляются в интернете. Читатели знают, что к вечеру в субботу в группе «ЦБС» появляется информация о прошедшем мероприятии: краткий рассказ, фотографии. Саму тему сопровождает музыка, представляющая суть рассказа, например, песня «Римские каникулы» – к Риму, песня «Золотые петухи» – к Риге и т. д. Добавляются в группу и видеоматериалы, показанные на мероприятии. Люди с удовольствием рассматривают их, пишут отзывы.

Были путешествия, немного отличающиеся от остальных: например, «Путешествие в мир поэзии Серебряного века» и «Рассказ о группе Битлз». Был создан слайд-фильм, рассказывающий о легендарной группе. Интересным для участников проекта оказался новый слайд-фильм

праграму першага ўвайшлі знаёмства з работай Бягомльскай гарпасялковай бібліятэкі імя П. Панчанкі, экскурсія ў пакой-музей Пімена Панчанкі, кансультацыя-знаёмства і электронная прэзентацыя «Работа бібліятэк у новых умовах», у якой быў адлюстраваны вопыт работы бібліятэк аграгарадкоў. У праграму другога семінара ўвайшлі інфарм-дайджэст «Роля рэлігійных каштоўнасцей у духоўна-маральным выхаванні моладзі», электронная прэзентацыя блока «Добрае слова» праграмы «ЛУЧ» дзіцячай раённай бібліятэкі, выступленне настаяцеля Свята-Пакроўскай царквы г. Докшыцы протаіерэя Георгія Мялешкі, выступленне пісьменніка-земляка, драматурга, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Фёдара Палачаніна.

Развіццю творчай ініцыятывы, перайманню цікавага вопыту калег спрыяюць паказальныя масавыя мерапрыемствы. Работнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу заўсёды аказваюць метадычную дапамогу ў іх падрыхтоўцы і правядзенні. У бягучым годзе ў Несцераўшчынскай бібліятэцы-клубе была падрыхтавана медыка-экалагічная гадзіна «Ёсць у травах і кветках гаючая сіла» з запрашэннем жанчын-траўніц. У Бягомльскай гарпасялковай бібліятэцы ладзілася краязнаўчая вечарына «Бульбяны банкет», а ў цэнтральнай раённай бібліятэцы – паэтычна-музычная вечарына «Дзе памяць сэрца ходзіць басанож…», якая была прысвечана паэту-земляку Эдуарду Зубрыцкаму.

Вось ужо два гады запар аддзелам бібліятэчнага маркетынгу рыхтуецца святкаванне Дня праваслаўнай кнігі. Мерапрыемства праходзіць на раённым узроўні ў кінаканцэртнай зале «Іскра». У мінулым годзе гэта быў тэматычны вечар «Духовные книги – книги о главном». У гэтым годзе прайшоў тэматычны вечар «Духовных книг божественная мудрость». У мерапрыемствах прымаюць удзел духавенства раёна, работнікі райвыканкама, настаўнікі і навучэнцы школ горада і раёна. Рыхтуюцца камп’ютарная прэзентацыя, разгорнутая выстава-агляд кніг духоўнай тэматыкі, выстава вышываных ікон.

Традыцыйнай формай павышэння кваліфікацыі з’яўляюцца

вытворчыя нарады. У рамках нарад мы праводзім Саветы пры дырэктары, знаёмім з цікавым вопытам работы бібліятэк рэспублікі, вобласці, раёна, прапануем кансультацыі, метадычныя парады па пытаннях бібліятэчнай работы, знаёмім з інавацыйнымі формамі работы. На пачатку года стала традыцыяй праводзіць круглы стол, падчас якога падводзяцца вынікі работы бібліятэк за мінулы год, вынікі аглядаў-конкурсаў, акрэсліваюцца перспектывы развіцця на год бягучы. У 2013 годзе круглы стол называўся «Зберагаем традыцыі, шукаем новае», на ім былі падведзены вынікі раённага агляду-конкурсу «Песняры зямлі беларускай» (на лепшую форму прапаганды творчасці Я. Купалы і Я. Коласа), былі акрэслены задачы бібліятэк сістэмы на 2013 год, аб'яўлены агляд-конкурс «Утульная бібліятэка» (на лепшае афармленне і арганізацыю бібліятэчнай прасторы), а таксама стартавала акцыя «Книги, которые меня потрясли». На працягу бягучага года для работнікаў сістэмы былі падрыхтаваны кансультацыі: «Клубы па інтарэсах пры бібліятэках», «Бібліятэка і сям'я: новыя рэаліі», «Бібліятэка як цэнтр сацыяльна-псіхалагічнай падтрымкі пажылых людзей», кансультацыя-прапанова «Дзейнасць бібліятэк па экалагічнай асвеце», экспрэс-інфармацыя «Інавацыйныя формы выставачнай дзейнасці».

Для таго, каб бібліятэкары маглі бліжэй пазнаёміцца з вопытам сваіх калег аддзел бібліятэчнага маркетынгу рэгулярна абагульняе лепшы вопыт работы бібліятэк па розных накірунках дзейнасці. У 2012 годзе быў абагульнены вопыт Станіслаўскай сельскай бібліятэкі па краязнаўстве і Таргуноўскай сельскай бібліятэкі па рабоце з людзьмі пажылога ўзросту.

Для таго, каб работа бібліятэк-філіялаў насіла мэтанакіраваны характар аддзелам маркетынгу распрацаваны і рэалізуюцца мэтавыя праграмы: «Бацькаўшчына светлая мая» (краязнаўчая дзейнасць), «Посвет памяці нашай» (патрыятычнае выхаванне), «Зямля – наш дом» (экалагічнае выхаванне), «Здароўе – жыцця ключы» (прапаганда здаровага ладу жыцця), «Сіла мудрасці – маладосць душы» (работа з пажылымі людзьмі).

Вядзецца актыўная работа па прыцягненні ў бібліятэку новых чытачоў, прапагандуюцца паслугі бібліятэкі. Прыцягненню новых

которой работают библиографы Полоцкой центральной районной библиотеки им. Ф. Скорины. Цель этой программы – повысить информационную грамотность людей, приобщить их к интернету, показать всю красоту и многогранность мира электронной информации. Технологии Web 2.0 предоставили библиотекарям новые возможности. Мы, как публичная библиотека, анализируем способы использования этих средств, не упуская из виду одну из важнейших своих задач – предоставление пользователям разнообразных услуг, в том числе и образовательных. Сегодня чаще, чем когда-либо пользователи библиотек становятся их виртуальными посетителями. Поэтому мы считаем себя обязанными быть «виртуально» современными и актуальными.

Но для того, чтобы работать с читателями по-новому, надо сначала подготовить их к этому, научить, сделать грамотными компьютерными пользователями. Посредством интернета библиотекарями создается еще одно новое пространство для налаживания обратной связи с аудиторией, отслеживания эффективности мероприятий в библиотеке, изучения вкусов и интересов читателей, обмена впечатлениями.

В центральной библиотеке им. Ф. Скорины с 2002 года проводятся тренинги по обучению компьютерной грамотности. Кажется, что сейчас большинство людей владеют основами работы на компьютере и более-менее свободно чувствуют себя в интернете. Но, как оказывается, это не так. Тренинги мы проводим давно, но до сих пор существует огромное количество людей, желающих обучаться: приходят записываться люди совершенно разных категорий: работающие (учителя, кассиры, работники ЖКХ, продавцы…), пенсионеры, учащиеся средних специальных учебных заведений. Мы учим основным навыкам работы на компьютере, основам поиска в интернете, интернет-общению, а потом – «жизни» в социальных сетях. Но, собственно, на этом наша работа не заканчивается, а только начинается. Библиографы вместе с читателями-пользователями начинают постигать просторы интернета.

Одной из форм реализации программы «Человек медийный»

«Афганістан», «Мабільны тэлефон», «Бібліятэкар», «Каханне», «Адзінота»…

Журы конкурсу вылучыла пераможцаў яшчэ па дзвюх намінацыях – «Дзіцячая бібліятэка» і «Сельская бібліятэка», нагадаем, што імі сталі дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А.С. Пушкіна Наваполацкай гарадской сеткі публічных бібліятэк і Будская сельская бібліятэка Дубровенскай раённай сеткі публічных бібліятэк адпаведна. Артыкулы аб вопыце іх работы – таксама ў нашым выпуску, але, як кажуць, з першых вуснаў.

Усіх, хто жадае глыбей пазнаёміцца з работамі пераможцаў конкурсу, запрашаем у аддзел бібліятэказнаўства абласной бібліятэкі: матэрыялы будуць захавацца там да канца года. Прыязджайце, гладзіце, натхняйцеся!

Галина Николаевна Нелина,
библиограф информационно-библиографического отдела
Полоцкой центральной районной библиотеки им. Ф. Скорины

ЧЕЛОВЕК МЕДИЙНЫЙ РОЖДАЕТСЯ В БИБЛИОТЕКЕ

Все знают, что в библиотеке хранятся книги, журналы и газеты, но ведь в библиотеке можно получить информацию и погрузившись в виртуальный мир. «Человек медийный» – так называется программа, по

карыстальнікаў спрыяе рэкламная дзейнасць. Работа са СМІ – важны накірунак рэкламы бібліятэкі. На старонках раённай газеты «Родныя вытокі» работа бібліятэк у бягучым годзе асвятлялася шмат разоў.

Супрацоўнікі аддзела праводзяць работу па стварэнні станоўчага іміджу бібліятэкі, распрацоўваюць візітныя карткі бібліятэкі, буклеты. Кожны год выдаецца «Каляндар знамянальных і памятных дат», «Метадычныя парады да складання планаў работы», буклеты з нагоды юбілеяў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, шматлікія рэкламныя буклеты. Асваенне новых камп'ютарных тэхналогій, тэкставых і графічных рэдактараў дазволіла супрацоўнікам аддзела хутка і на высокім мастацкім узроўні выдаваць рэкламныя лістоўкі, буклеты, афармляць тэматычныя папкі, самім вырабляць дыпломы, віншавальныя граматы.

Вялікая ўвага надаецца афармленню бібліятэчнай прасторы. Супрацоўнікі аддзела дапамагаюць сельскім бібліятэкарам у правільнай арганізацыі памяшкання, распрацоўваюць тэматыку кніжных выстаў, даюць парады па раскрыцці кніжнага фонду.

Значная ўвага ўдзяляецца праектнай дзейнасці. З мэтай зацікавіць бібліятэчнай прадукцыяй і паслугамі жыхароў раёна нашым аддзелам быў распрацаваны і рэалізуецца рэкламны праект «Библиотека вне стен», які стартаваў на раённым свяце «Квітней, Докшыцкі край». У ходзе свята распаўсюджваліся рэкламныя буклеты-запрашэнні, праводзіліся бяспроігрышная латарэя і літаратурнае лато, прэс-віктарына. Пэўную цікавасць выклікала акцыя «Я за чытанне». Гараджанам былі прапанаваны выстава краязнаўчых матэрыялаў «Бібліятэка піша летапіс» і выстава выдавецкіх матэрыялаў «Рэкламны лістапад». Падчас гарадскога свята «З Днём нараджэння, любімы горад» на пляцоўцы «Территория детства» работнікі аддзела прадставілі фотакалаж «Горад: учора, сёння, заўтра…», дзе размясцілі фотаздымкі горада ў мінулым, горада цяперашняга, а побач дзеці малявалі горад будучага. Было праведзена апытанне гараджан «Горад Докшыцы для мяне…», ладзілася бяспроігрышная латарэя «Святочная».

З мэтай звярнуць увагу бацькоў на праблему дзіцячага чытання па

гарадскім маршруце на працягу пэўнага часу курсіраваў «Чытаючы аўтобус», салон якога ўпрыгожвалі плакаты аб карысці чытання, размяшчаліся рэкламныя буклеты. У ходзе рэалізацыі гэтага праекта павялічылася наведвальнасць бібліятэк, паявіліся новыя чытачы. Работа ў гэтым напрамку працягваецца і сёння.

Распрацаваны і рэалізуецца праект «Каб восень жыцця была залатой». Яго мэта – аказаць пажылым людзям дапамогу ў актыўнай адаптацыі і самарэалізацыі ў сучасным грамадстве. Ён накіраваны не толькі на чытачоў бібліятэкі, але і на ўсё насельніцтва зоны абслугоўвання, у тым ліку, з абмежаванымі магчымасцямі.

Аддзел праводзіць сацыялагічныя даследванні праз апытанні розных груп карыстальнікаў, якія дазваляюць выявіць сучасныя інфармацыйныя запыты чытачоў. Сярод іх – «Бібліятэка ў жыцці пажылога чалавека», «Библиотека в оценке и представлении библиотекаря», «Чтение в жизни подростков-читателей библиотек» і інш.

Штогод сярод бібліятэк раёна праводзяцца раённыя агляды-конкурсы, якія дапамагаюць бібліятэкарам паказаць сябе, выявіць таленты, праявіць творчасць, знаходзіцца ў пастаянным пошуку. Актыўна ўдзельнічалі бібліятэкары ў аглядах-конкурсах: «Палітра прафесійнага майстэрства» (на лепшае масавае мерапрыемства), «Гісторыя роднага краю» (на лепшае напісанне гісторыі сваёй мясцовасці), «Інавацыі ў рабоце бібліятэк». У бягучым годзе аб’яўлены конкурс «Утульная бібліятэка». Яго мэта – павышэнне камфортнасці бібліятэчнай прасторы, стварэнне індывідуальнага стылю, фарміраванне іміджу бібліятэкі як культурнага цэнтра. Акрамя гэтага, штогод прымаем удзел у абласных аглядах-конкурсах.

Сучасная бібліятэка павінна пастаянна развівацца, вывучаць вопыт іншых бібліятэк, укараняць новыя формы і метады работы, дадатковыя паслугі. Для гэтага і існуе аддзел бібліятэчнага маркетынгу, у далейшых планах якога – пошукі новага, цікавага, неардынарнага для сучаснага чытача.

колькасці набраных балаў не ўвайшла ў лік пераможцаў, з чым асобныя члены журы катэгарычна нязгодныя. Менавіта вакол гэтай работы разгарэліся самыя гарачыя спрэчкі. Таму хочацца нагадаць і яе. Лепяльчане прадставілі на конкурс абагулены вопыт работы па ўшанаванні памяці іх славутага паэта-земляка Тодара Кляшторнага. Цэнтральным мерапрыемствам у гэтай рабоце стала падрыхтоўка і правядзенне 18 красавіка бягучага года ў Лепельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 110-годдзю Т. Кляшторнага., якая сабрала родных паэта, навукоўцаў Беларускага дзяржаўна ўніверсітэта, якія займаюцца даследчай працай па вывучэнні жыццёвага і творчага шляху паэта, настаўнікаў, бібліятэкараў і музейных работнікаў горада і раёна. Асаблівае месца ў працы канферэнцыі заняло выступленне малодшай дачкі паэта – Маі Тодараўны. Па выніках работы канферэнцыі выдадзены зборнік яе матэрыялаў, які, прынамсі, у поўнатэкставым фармаце размешчаны на сайце ЦБС.

«Складана знайсці новую буйную форму папулярызацыі кнігі і чытання. Таму работнікі імкнуцца звярнуць увагу моладзі гучнай назвай, сучасным слоганам, яркай аб’явай, індывідуальным падыходам. Выкарыстоўваюцца невялікія, але прывабныя і цікавыя для моладзі формы», – вызначылі ў заяўцы да ўдзелу ў конкурсе глыбоцкія бібліятэкары, і, верагодна, маюць рацыю. Нагадаем, што менавіта Падсвільская гарпасялковая бібліятэка Глыбоцкай ЦБС стала пераможцай у адпаведнай намінацыі. Бібліятэкары Падсвілля не замахваюцца на мега-ды мультыпраекты, але ж і іх пошукі новых рашэнняў нярэдка становяцца даволі паспяховымі. Больш за ўсё членаў журы зацікавіла такая форма стымулявання творчых задаткаў чытачоў як напісанне сінквейнаў – пяцірадковых вершаў, якія не прадугледжваюць падбору рыфмы і рытму, а патрабуюць толькі ўласнага бачання і адносін да тэмы або праблемы. Сінквейны з задавальненнем пішуць як члены падлеткавага клуба «Лінія», так і ўдзельніцы жаночага клуба «Сяброўкі», што дзейнічаюць у Падсвільскай бібліятэцы. Тэмы сінквейнай задаюцца доволі разнастайныя:

«Обелиски застыли сурово, охраняя погибших солдат». Колькасць брацкіх могілак на Сенненшчыне налічваецца дзясяткамі. Сістэматызаваць іх паставілі сваёй задачай супрацоўнікі бібліятэкі, якія на працягу некалькіх год збіралі адпаведныя матэрыялы. У рабочую групу ўвайшлі дырэктар ЦБС Н.Р. Паляшчук, супрацоўнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу (загадчык Т.М. Красноўская) і бібліёграф В.Д. Пракаповіч. Актыўную дапамогу ў рабоце аказалі сельскія бібліятэкары раёна. У ходзе рэалізацыі праекта кожны помнік быў сфатаграваны, узноўлены спісы загінуўшых. Вялікі аб'ём друкавах матэрыялаў па тэме, у тым ліку прадастаўленых мясцовымі краязнаўцамі, быў прагледжаны дэ візу.

Па выніках пошукава-даследчай работы было падрыхтавана выданне, якое стала своеасаблівым дадаткам да кнігі «Памяць. Сенненскі раён». У ім размешчаны фотаздымкі помнікаў воінам і партызанам, іх кароткая характарыстыка і спісы захароненых, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны пры абароне і вызваленні Сенненскага раёна. Сістэматызацыя помнікаў ажыццяўлена па тэрытарыяльнай прыкмеце: матэрыял размешчаны па сельскіх саветах, унутры – у алфавітным парадку населеных пунктаў. Пасля кожнага раздзела прыведзены бібліяграфічныя спісы крыніц, у якіх згадваюцца пералічаныя помнікі і захараненні.

Праект завяршыўся прэзентацыямі зборніка для розных аўдыторый. Яго каштоўнасць была адзначана інтэлігенцыяй раёна, прадстаўнікамі органаў улады. Журы конкурсу таксама высока ацаніла прадзеланую работу, асаблівую зацікаўленасць у зборніку выказалі спецыялісты аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Віцебскай абласной бібліятэкі. Спадзяёмся, што дадзены матэрыял будзе прыняты прыхільна шырокай супольнасцю бібліятэкараў Віцебшчыны, тым больш што ён даступны кожнаму ў сусветнай сетцы: складальнікі зборніка размясцілі яго на сваім афіцыйным сайце і за гэта ім – вялікі дзякуй!

Яшчэ адна работа, якая была пададзена на конкурс – навукова-даследчы праект Лепельскай цэнтральнай бібліятэкі. На жаль, работа па

Ала Сямёнаўна Закалінская,
загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Докшыцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі

«ДАКШЫЧАНКА»: З ВОПЫТУ РАБОТЫ КЛУБА ПА ІНТАРЭСАХ

Удзельніцы клуба або нарадзіліся ў Докшыцах, або доўгі час жывуць у іх, любяць свой горад і звязваюць з ім шмат успамінаў. Таму ён і атрымаў назву «Дакшычанка». Сваю дзейнасць клуб пачаў у 2001 годзе пры цэнтральнай раённай бібліятэцы і хутка стаў месцам сустрэч.

Клуб наведвае той, хто малады душой і не згубіў запалу, незалежна ад колькасці пражытых гадоў, той, хто сябруе з бібліятэкай, ідзе па жыцці не развітваючыся з кнігай, з песняй, хто шукае зносін і любіць жарт, каму патрэбны сапраўдныя сябры. Дэвізам клуба сталі словы вядомага паэта Роберта Раждзественскага «Не только грусть мои года, мои года – мое богатство». Пра кожную з жанчын можна сказаць самыя добрыя, шчырыя, цёплыя словы. Усе яны знаходзяцца на заслужаным адпачынку. Нягледзячы на ўзрост, у душы яны так і застаюцца маладымі. Усе з'ўляюцца актыўнымі і шматгадовымі чытачамі бібліятэкі, якія не прапускаюць ніводнай кніжнай навінкі.

За час існавання клуба жаданымі гасцямі былі пісьменнікі, урачы, артысты, майстры мастацкай самадзейнасці. Наведвальнікі клуба мелі магчымасць сустрэцца з нашым земляком – членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатам рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» і літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча – пісьменнікам

Фёдарам Палачаніным.

Сустрэча з мясцовымі паэткамі Ірынай Козел, Віялетай Навіцкай, Валянцінай Шчарбаковай, юнай паэткай Ірынай Круковіч надоўга запомнілася прысутным. Чытальная зала на нейкі час ператваралася ва ўтульнае кафэ: усё схіляла да лірычнага настрою. У зале гучалі вершы на беларускай і рускай мовах пра родныя мясціны, радзіму, каханне.

Добры настрой, светлыя пачуцці пакінула ў членаў клуба сустрэча з вядомай у нашым раёне паэтэсай Марыяй Дзюбак, пераможцай паэтычнага конкурсу часопіса «Алеся». «Гармонія гукаў, фарбаў і слоў – маё жыццё, мая любоў» – так называлася сустрэча, якая адбылася ў чытальнай зале раённай бібліятэкі. Прысутныя з задавальненнем паслухалі любімыя вершы аўтара, дазналіся пра яе жыццёвы і творчы шлях, знаёмства са знакамітымі паэтамі. Гутарка з Марыяй Браніславаўнай атрымалася цёплай, шчырай і цікавай.

На сустрэчу ў літаратурную гасцёўню была запрошана яшчэ адна наша зямлячка, пераможца многіх раённых і абласных творчых конкурсаў паэтэса Людміла Салянка. Яна пазнаёміла сяброў клуба з першай кнігай сваіх вершаў «Жыву я подыхам нябёс». Людміла Ігнацьеўна парадавала ўсіх сваімі вершамі, у якіх яна выказала свае пачуцці, думкі і душу.

У 2011 годзе клуб «Дакшычанка» адзначыў сваё дзесяцігоддзе. «Дакшычанак» гасцінна чакала ўпрыгожаная зала. Урачыстае пасяджэнне прайшло пад назвай «Любоў да кнігі аб'яднала нас». Гэта было цікавае свята, дзе было месца віншаванням, сюрпрызам, падарункам.

За гады існавання клуба адбылося шмат цікавых мерапрыемстваў. І кожнае з іх – гэта адкрыццё нечага новага. Асаблівую цікавасць выклікала пасяджэнне, на якім адбыўся жартоўны «Паядынак з гарманістам». Вядомы ў раёне баяніст, акампаніятар, неаднаразовы пераможца абласных конкурсаў музычнага мастацтва Яўген Ганчароў выклікаў на паядынак каманду «Дакшычанак». Удзельнікі паядынку па чарзе адказвалі на пытанні вядучай, якія тычыліся музыкі, паэзіі, спявалі самі. Якім галантным ні быў бы Яўген Уладзіміравіч пад час паядынку,

КОНКУРС

Правядзенне прафесійных конкурсаў – справа складаная: тыя, хто іх праводзіў гэта падцвердзяць. Правядзенне конкурсу інавацый – справа складаная ўдвая: суб'ектывізм заўжды прысутнічае пры ацэнцы работ, парой шаноўныя члены журы маюць дыяметральна супрацьлеглыя меркаванні наконт той ці іншай інавацыі. Падвядзенне вынікаў абласных бібліятэчных конкурсаў нярэдка праходзіць, як кажуць на эмоцыях, «Інавацыі» 2013 года не сталі выключэннем. Асобныя члены журы прыйшлі да высновы, што і на сённяшні дзень не ўсе нашыя калегі вызначылі для сябе паняцце інавацый. Канешне, у шырокім сэнсе любое новаўвядзенне ў бібліятэцы можна разглядаць як інавацыю, але ж калі гэтая навіна для ўсіх вокруг астатніх «дела давно минувших дней», то неяк няёмка хваліцца такім «прарывам»...

На жаль, фармат нашага зборніка не дазваляе прывесці поўны і глыбокі аналіз работ, пададзеных на конкурс, але колькі слоў пра кожнага пераможцу сказаць лічым нялішнім, тым больш, што як не спрачаліся члены журы, а лідары ўсё ж былі відавочнымі для ўсіх.

На абласны конкурс «Інавацыі ў рабоце бібліятэк» у бягучым годзе было пададзена 19 заявак на ўдзел ад 17 ЦБС вобласці, пры тым 9 з іх – у намінацыі «Цэнтральная бібліятэка», мінавіта ў ёй разгарнулася самая вострая барацьба ўдзельнікаў. З іх былі вылучаны цэнтральныя бібліятэкі Полацкага і Сенненскага рэгіёнаў. Што датычыцца палачан, то ў зборніку мы прыводзім артыкул Галіны Мікалаеўны Нелінай, якая падагульняе ўдалы вопыт інавацыйных інфармацыйна-асветніцкіх праектаў «Web-пенсіянер: асваенне інтэрнэта для тых, каму за 60» і «Чалавек медыйны».

Асаблівай увагі заслугоўвае праект Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, вынікам якога стала выданне ўнікальнага гісторыка-краязнаўчага зборніка, прысвечанага тэме помнікаў воінам Вялікай Айчыннай вайны і захараненням на тэрыторыі Сенненскага раёна

Клуб «Субяседніца» прымаў удзел у аглядзе-конкурсе на лепшы панадворак «Юбілейны каравай, сяброў сустракай» у рамках XX Міжнароднага фестывалю песні і музыкі Падняпроўя Расіі, Беларусі і Украіны «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне».

У бягучым годзе клуб стаў удзельнікам і дыпламантам XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцеску» за актыўны ўдзел у тэматычным экалагічным мерапрыемстве.

Належная ўвага надаецца выдавецкай дзейнасці клуба. Былі падрыхтаваны і выдадзены буклеты «О луковицах кратко и по делу», «Почти все о яблонях», «Нота *фа* и нота *соль* получается *фасоль*», «Моя дорогая картошка», «Витамины про запас» і інш.

Актыўна, творча працуе Савет клуба, які дасылае цікавыя матэрыялы ў рэдакцыі рэспубліканскіх і раённай газет, часопісы «Целитель», «Хозяин» і інш.

усё ж такі жанчынам прыйшлося ўступіць яго музычнай эрудыцыі!

Традыцыйна кожны год праводзяцца сумесныя мерапрыемствы клуба аматараў кнігі «Дакшычанка» і клуба «Кацюша», які працуе пры Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У літаратурным кафэ вялі размову пра прыгажосць роднай зямлі. Гучалі вядомыя вершы пра прыроду С. Ясеніна, А. Пушкіна, Ф. Цютчава, П. Панчанкі.

Адпачыць душой, палепшыць настрой запрашаў літаратурна-музычны калейдаскоп «Мир цветов таинствен и прекрасен». Удзельніцы клубаў расказвалі легенды аб кветках, віншавалі тых, хто носіць кветкавыя імёны, чыталі вершы, выконвалі песні, прысвечаныя кветкам.

Па традыцыі Дзень пажылых людзей – гэта свята чалавечай мудрасці, грамадзянскай сталасці, душэйнай шчодрасці. Клубы «Дакшычанка» і «Кацюша» сумесна адзначылі гэтае свята. У гэты раз членаў клуба «Дакшычанка» запрасіла да сябе «Кацюша» на вечарыну жыццёвай мудрасці «На висках седина, а душа молода». Гэта была сустрэча з віншаваннямі, пажаданнямі, конкурсамі, жартамі, рознымі прысмакамі, якія прынеслі ўдзельніцы клубаў. Жанчыны зачаравалі ўсіх сваімі песнямі. Галасы – маладыя, энергетыка добрая, моцная. Нам, маладзейшым, нават перадаўся іх запал. Разыходзіцца нікому не хацелася: з маладосцю і прыгажосцю, што нечакана вярнуліся, цяжка было развітвацца. Сталыя людзі добра разумеюць, што самае галоўнае ў жыцці – гэта само жыццё, незалежна ад пары года і надвор’я. Як аказалася, члены абодвух клубаў надзелены шматлікімі талентамі, якімі яны ўмеюць шчодра дзяліцца. Гэта акалічнасць робіць пенсійнае жыццё сапраўды цікавым і насычаным.

Пры арганізацыі мерапрыемстваў выкарыстоўваюцца самыя розныя формы: тэматычна-пазнавальныя сустрэчы, конкурсы чытацкіх фармуляраў, рэтра-вандроўкі з любімай кнігай, дыскусіі, турніры знаўцаў літаратуры, літаратурныя эцюды і інш.

З поспехам прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Дню жанчын, маці, сям’і. Святочны, узрушаны настрой панаваў падчас вечара-

віншавання да Дня жанчын. Вельмі ўдала дапоўніла мерапрыемства выстава, на якой былі прадстаўлены работы «дакшычанак». Дзень сям'і адзначалі ў гасцёўні «Партрэт вашай сям'і». Жанчыны прынеслі з сабой альбомы з фотаздымкамі, каб яшчэ раз перагарнуць старонкі жыцця. На Дзень маці віншавалі матуль са святам, спявалі іх любімыя песні. На бібліясустрэчу да Дня бібліятэк «У нас как в песне: мы одна семья» сабраліся ўсе члены клуба. Яны пранікнёна чыталі вершы, удзельнічалі ў конкурсах на лепшае выкананне прыпевак.

Усе ўдзельніцы клуба – дзеці вайны, таму такім цёпла-шчымлівым атрымалася мерапрыемства «Успамінаюць дзеці вайны», у якое кожны ўклаў памяць свайго сэрца. Жанчыны, не тоячыся, выціралі слёзы, калі іх калегі па клубе пранікнёна чыталі вершы пра тое, як ваявалі салдаты на вайне, як іх чакалі каханыя, як ім хацелася жыць і любіць. А затым паліліся песні пра агеньчык на дзявочым акне, пра Перамогу, якую чакалі Вена, Альпы і Дунай.

Без магчымасці выказацца, падзяліцца убачанай, пачутай, прачытанай інфармацыяй, паспрачацца, чалавек паўнацэнна існаваць не можа. Яму патрэбны аднадумцы, сябры па захапленні. І зараз дакшычанкі не ўяўляюць свайго жыцця без клуба, куды яны прыходзяць кожны месяц, каб сустрэцца ля самавара і пагутарыць аб кнігах, мастацтве, адзначыць дзень нараджэння, сустрэцца з цікавымі людзьмі, а то проста паспяваць, пачытаць вершы...

Пра работу клуба можна прачытаць на старонках раённай газеты «Родныя вытокі». Кожная сустрэча «Дакшычанкі» – гэта сапраўднае свята душы. Стаць удзельнікам клуба можа любы, хто хоча з карысцю правесці свой вольны час, абмяняцца цікавай інфармацыяй, атрымаць зарад бадзёрасці, прыняць удзел у мерапрыемствах, сустрэцца з цікавымі людзьмі, ці проста прыемна адпачыць і зрабіць сваё жыццё больш яркім і разнастайным.

спосабам добраўпарадкавання дачнага ўчастка – французскім агародам. Для большай нагляднасці быў наладжаны прагляд слайд-шоу. Напрыканцы мерапрыемства кіраўнік клуба пазнаёміла прысутных з буклетам «О луковицах: кратко и по делу», які быў выдадзены з улікам вопыту членаў клуба.

Атрымалі шмат станоўчых водгукаў тэматычная вечарына «Ода фасольке», вячоркі «Яблычны Спас», вечар адпачынку «Озорные, молодые, поворотливые», конкурсная праграма «Яблычныя вячоркі». Выстава-дэгустацыя «Фантазія ў слоіках» дазволіла не толькі набыць рацэпты блюд, але і пачаставаць іх.

Аматарам-кветкаводам прыйшлося даспадобы свята кветак «Цуда-кветка», сугучным дапаўненнем да якога стала віктарына і слайд-шоу аб кветках. Дзень садавода «Мой цудоўны сад» быў карысным і цікавым для садаводаў-аматараў. У рамках мерапрыемства адбыўся агляд ля кніжнай выставы «Ваш цудоўны сад», гульнёвая праграма, прэзентацыя інфармацыйнага буклета «Усё аб яблынях».

Цікава прайшоў тэматычны вечар «Очарование женского имени», да якога была афармлена кніжная выстава «В мире имен». На мерапрыемства быў запрошаны краязнавец Мікалай Васільевіч Кляцкоў, які займаецца гісторыяй імён і прозвішчаў Дубровеншчыны.

Шмат цікавых і карысных парад змяшчалі гутаракі-рэкамендацыі «Сартавы памідор», «Сучасная сартавая бульба», «Хрызантемы – цветы осени», «Рассада, рассада, расти как надо», кансультацыя «Вітаміны для гародніны» і інш.

Штогод клуб «Субяседніца» прымае ўдзел у раённых выставах кветак. Яны заўсёды з'яўляюцца ўдалым дапаўненнем да мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі. Да Дня пажылых людзей члены клуба рыхтуюць выставы лекавых раслін, да раённага фестывалю пенсіянераў «Нам года – не беда» – выставы нарыхтовак агародніны, частуюць удзельнікаў фестывалю духмянай гарбатай з лекавых траў.

Стала добрай традыцыяй у час летніх адпачынкаў наведваць прысядзібныя ўчасткі членаў клуба, а пад час наведванняў занатоўваць вопыт работы, рабіць фотаздымкі, збіраць карысную інфармацыю.

Наступная традыцыя – урачыстае прыняцце ў склад «Субяседніцы» новых членаў. Амаль кожнае пасяджэнне праходзіць за кубкам духмянай гарбаты з лекавых раслін, што вырасцілі на сваіх участках члены клуба.

Станоўчую работу праводзіць клуб па добраўпарадкаванні сумежнай з цэнтральнай раённай бібліятэкай тэрыторыі. Члены клуба даюць кампетэнтную кансультацыю работнікам сельскіх бібліятэк па азеляненні тэрыторыі каля бібліятэкі.

З мэтай набыцця якаснага і новага насеннага матэрыялу, удзельнікі клуба штогод наведваюць Батанічны сад Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, пітомнікі Сенненскага і Аршанскага раёнаў. Наладжана перапіска з вядомымі кветкаводамі вобласці і рэспублікі.

Раскрыццю здольнасцей членаў клуба садзейнічаюць персанальныя выставы. Былі арганізаваны персанальныя выставы Валянціны Уладзіміраўны Дударавай «Кустарники», выстава Людмілы Міхайлаўны Шайтар «Ірысы», Галіны Пятроўны Галубцовай «Ліліі – каралеўскія кветкі», «Кветкавыя кампазіцыі» і інш.

У зімовы час інтэр'ер бібліятэкі заўсёды сустракае чытачоў яскравасцю хатніх кветак, выставы якіх арганізоўваюцца на працягу амаль усяго зімовага перыяду. Былі падрыхтаваны выставы «Мозаика цветов», «Комнатны рай своими руками», «Цикламен – талисман для дома», «Мамины цветы», «Фиалок маленький букетик» і інш.

Шмат намаганняў, творчага натхнення і цікавых ідэй кіраўнік клуба і яго ўдзельнікі імкнуцца ўвасобіць у сцэнарыі адчыненых пасяджэнняў, бо менавіта яны з'яўляюцца своеасаблівай справаздачай, вынікам работы клуба і, безумоўна, яго рэкламай.

Нашай любімай гародніне – бульбе быў прысвечаны тэматычны вечар «Здравствуй, милая картошка». На прэзентацыя фотавыставы «Зялёны дызайн» члены клуба пазнаёміліся з цікавым і незвычайным

Алена Уладзіміраўна Гудзь,
загадчык Докшыцкай дзіцячай раённай бібліятэкі

ЧАС ПАДВОДЗІЦЬ ВЫНІКІ: РАБОТА ДОКШЫЦКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ ПА ПРАГРАМЕ «ЛУЧ»

Докшыцкая дзіцячая бібліятэка сёння – гэта 2100 чытачоў, у карыстанні якіх кніжны фонд колькасцю 21000 экзэмпляраў. «Захавальнікі кніжнага скарбу», менавіта так называюць сябе бібліятэкары, сваёй галоўнай задачай лічаць выхаванне сапраўднага чытача – цікаўнага, дапытлівага, разумнага і разважлівага.

Як вядома, у сучасным свеце існуе шмат магчымасцей для ўсебаковага развіцця асобы, але навукоўцы б'юць трывогу – дзеці губляюць здольнасць да лагічнага мыслення. Медыкі, у сваю чаргу, сцвярджаюць, што для нармальнага функцыяніравання чалавечага мозгу кожнаму чалавеку неабходна прачытваць 20-25 старонак мастацкага тэксту ў дзень.

Мы разумеем, што час не стаіць на месцы, і ў наш век інфармацыйных тэхналогій кніга як бы адыйшла на другі план, але ўсё часцей і часцей гучыць думка пра тое, што трэба выхоўваць чытаючае пакаленне. Ад таго, што і як чытаюць нашы дзеці залежыць іх сённяшняе і далейшае жыццё. Каб данесці да чытача важнасць чытання, у 2009 годзе наша дзіцячая бібліятэка пачала працаваць па праграмме падтрымкі і развіцця чытання «ЛУЧ» («Лучшее учение – чтение»).

Аналізуючы сваю пяцігадовую работу, мы можам сказаць – праца

была недарэмнай. Бібліятэкары адзначаюць той факт, што ўзрасла актыўнасць чытачоў сярэдняга школьнага ўзросту, а менавіта на гэта была арыентавана падпраграма «Открывая книгу – открываем мир». Дзеці сталі не толькі больш чытаць, але і дзяліцца радасцю ад прачытанага са сваімі сябрамі. Павялічылася ў нашай бібліятэцы колькасць чытачоў-дашкольнікаў, выявіліся чытаючыя дынастыі, узрасла колькасць сямей, якія лічаць лепшым адпачынкам наведванне бібліятэкі разам з дзецьмі. Усяму гэтаму паспрыяла падпраграма «Малышок».

Падмеціўшы цікавасць у чытачоў да кніг духоўнага зместу, мы дадаткова распрацвалі падпраграму «Добрае слова», разлічаную на супрацоўніцтва з праваслаўнай царквой. Адзначым, што ўжо другі год на базе нашай бібліятэкі працуе нядзельная школа. Самі бібліятэкары прымаюць самы актыўны ўдзел у рабоце нядзельнай школы. Мы праводзім сумесныя мерапрыемствы, робім тэматычныя агляды, арганізуем кніжныя выставы, дапамагаем у падрыхтоўцы ўрокаў. Дарэчы, фонд духоўнай літаратуры складае амаль 800 кніг.

Задаволены бібліятэкары вынікамі сваёй работы па падпраграме летняга чытання «Лето. Читатель. Книга». Для таго, каб зацікавіць сваіх чытачоў бібліятэка арганізуе конкурсы летняга чытання, прычым кожны год розныя. Мы то адпраўляемся ў падарожжа вакол свету за 90 дзён, то «запальваем зоркі», то ствараем кнігу лета. Вынік заўседы аднолькавы – дзеці чытаюць, чытаюць з захапленнем, спаборнічаюць паміж сабой.

На жаль, «не спрацавала» падпраграма «Время чытать», якая была разлічана на падлеткаў. Прычыны розныя… Магчыма, мы не «дастукаліся» да іх таму, што недастаткова рэкламавалі сваю работу, а магчыма, проста «прайгралі вайну з камп'ютарам». Але спадзяёмся, што чытачы, якіх мы «вялі» на працягу гэтых пяці год, не здрадзяць кніжнаму слову стаўшы падлеткамі, а потым дарослымі.

Ну, а мы… Мы вывучаем вопыт сваіх калег, пераглядваем прафесійную прэсу, шукаем новыя і цікавыя формы работы, рыхтуемся працягваць работу па праграме падтрымкі і развіцця чытання «ЛУЧ».

Ірына Мікалаеўна Масейка,
загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Дубровенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

САДОЎНІКАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА: НАРОДНЫ КЛУБ «СУБЯСЕДНІЦА»

Клуб «Субяседніца», мэта якога аб'яднанне аматараў агародніцтва, садаводства і кветкаводства, стварэнне магчымасцей і неабходных умоў для іх зносін, дзейнічае пры цэнтральнай раённай бібліятэцы з 1996 года. У 2003 годзе яму было прысвоена званне «народны».

Пасяджэнні клуба – гэта сустрэчы аднадумцаў, якія спрыяюць і асветніцкай рабоце сярод насельніцтва, і раскрыццю творчых здольнасцей членаў клуба. На пасяджэннях адбываецца абмен вопытам аматараў агародніцтва, садаводства, кветкаводства, сустрэчы са спецыялістамі сельскай гаспадаркі і работнікамі іншых сфер дзейнасці.

Клуб «Субяседніца» мае свае традыцыі. Адна з іх – арганізацыя выстаў вырашчанай на прысядзібных участках гародніны, садавіны. Былі праведзены выстава насення і расады «Насенне», выстава вырашчанай прадукцыі «Щедрое лето», «Огород – всегда доход», «Участок в авоське», выстава «Асенні накцюрн» і інш. У гэтым годзе была арганізавана выстава-кірмаш членаў клуба «Осень красна плодами».

функцыянальная прылада, тэлевізар, DVD-прайгравальнік. Электронныя і АВ-дакументы бібліятэкі – гэта больш за 60 дыскаў: мультымедыйныя энцыклапедыі, тэматычныя слоўнікі, аўдыёкнігі, дыскі з кароткаметражнымі мастацкімі і мультыплікацыйнымі фільмамі, навучальныя прагарамы, гульнёвыя і музычныя дыскі.

У 2009 годзе пры дзіцячай бібліятэцы быў створаны і дзейнічае па сённяшні дзень клуб літаратурных сустрэч «На завалинке», мэтай якога з'яўляецца папулярызацыя чытання сярод дзяцей. З 2000 года быў створаны дзіцячы лялечны гурток «Церамок», які працуе пры раённым Доме культуры. Нязменным кіраўніком гэтага гуртка з'яўляецца загадчыца дзіцячай бібліятэкі – В.В. Усцінава. У рэпертуары тэатра налічваецца каля 50 лялечных пастановак. З казкамі яго ўдзельнікі выступаюць у школах горада, дзіцячых садках, на сцэне раённага Дома культуры.

Самымі відовішчнымі мерапрыемствамі ў 2013 годзе былі тэатралізаванае прадстаўленне «Наша пресса на все интересы», свята дзяцінства «Дом дружбы», прысвечанае Міжнароднаму дню аховы дзяцей, ранішнік «Моя Вообразилия» (да 90-годдзя з дня нараджэння Б. Захадэра), медыйная прэзентацыя да Дня пісьменства «От глиняной таблички к печатной страничке», краязнаўчы ўрок «Потомству в пример», ранішнік «В гости к сказочнику» (да 385-годдзя з дня нараджэння Ш. Перо) і шмат іншых.

У кастрычніку 2013 года дзіцячая бібліятэка святкавала свой 60-гадовы юбілей. З цёплымі словамі падзякі звярнулася да дружнага, працавітага калектыву бібліятэкі начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Л.А. Дударава. Павіншаваць супрацоўнікаў бібліятэкі з юбілеем прыехаў дырэктар Віцебскай абласной бібліятэкі А. І. Сёмкін, які перадаў ганаровую грамату Віцебскага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі і падарункі ад калектыву Віцебскай абласной бібліятэкі.

Свята прайшло, але для дзяцей заўсёды адчынены дзверы гэтага ветлівага дома – дзіцячай бібліятэкі, дзе іх чакаюць сустрэчы з цікавымі і любімымі кнігамі і людзьмі, з якімі ніколі не бывае сумна.

Кароткая даведка

Дубровенскі раён – на паўднёвым усходзе Віцебскай вобласці. Плошча 1,3 тыс. км². Мяжуе з Аршанскім раёнам Віцебскай вобласці, Горэцкім – Магілёўскай вобласці, Краснінскім і Руднянскім раёнамі Смаленскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка і аўтамагістраль Брэст–Масква. Насельніцтва – звыш 15 тыс. чалавек (8 тыс. – сельскае, звыш 7 тыс. – гарадское). Цэнтр – горад Дуброўна, размешчаны ў 90 км ад г. Віцебска і 230 км ад г. Мінска. 1514 год – першае ўпамінанне Дуброўна як горада. Па тэрыторыі раёна праходзіць Балтыйска-Чарнаморскі водападзел.

Знакамітыя людзі раёна: дзекабрыст П. Фаленберг, паэты і пісьменнікі С. Ракіта, Н. Горулеў, драматург А. Дудараў, герой руска-турэцкай вайны А. Казарскі.

Герб г. Дуброўна: у блакітным з чорным швом сценным полі варажскага шчыта – срэбныя закругленыя ўверсе вароты з закрытымі блакітнымі дзвярамі, якія ўвершаны залатой дубовай галінай з жолудам і двума лісцінкамі. Унізе варот – такія ж залатыя дубовыя галіны. Выява сімвалізуе геаграфічнае размяшчэнне г. Дуброўна на ўсходняй граніцы Беларусі, шляху на Маскву. Гэты населены пункт – галоўныя «ўсходнія вароты» Беларусі.



Наталля Мікалаеўна Фарэйтарава,
дырэктар Дубровенскай сеткі публічных бібліятэк

БІБЛІЯТЭКІ ДУБРОВЕНСКАГА РАЁНА: ВОПЫТ. ПРАБЛЕМЫ. ПОШУК

У апошнія гады мы сталі сведкамі таго, як змяніліся нашы ўяўленні аб бібліятэках, іх магчымасцях, іх месцы ў культурна-асветніцкай і інфармацыйнай інфраструктуры рэгіёна, у грамадскім і палітычным жыцці.

Сучасная бібліятэка – гэта не проста кнігасховішча. Гэта шматфункцыянальная ўстанова культуры, інфармацыйны, сацыя-культурны і асветніцкі цэнтр, які ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу і запытамі розных сацыяльных слаёў насельніцтва шырока і актыўна ўкараняе ў сваю дзейнасць новыя інфармацыйныя тэхналогіі.

У склад Дубровенскай сеткі бібліятэк уваходзіць 22 установы: цэнтральная раённая бібліятэка, дзіцячая бібліятэка, гарадская бібліятэка-філіял № 17, 15 сельскіх бібліятэк, 2 бібліятэкі-клуба, 1 бібліятэка-музей ільну і бібліятэка-цэнтр экалагічнай асветы насельніцтва.

Карыстальнікамі бібліятэк з'яўляюцца больш за 11 тыс. жыхароў. Акрамя таго ў нас эфектыўна выкарыстоўваецца такая мабільная форма бібліятэчнай дзейнасці як бібліобус, што дазваляе рэгулярна абслугоўваць з прадастаўленнем інфармацыі ў поўным аб'ёме і на розных носьбітах каля 300 чытачоў з аддаленых вёсак.

материнство», работа з бацькамі).

У рамках праекта быў арганізаваны шэраг мерапрыемстваў для дарослых: «Причуды беременных», «А у нас сегодня гость», «Сустрэча з цікавым чалавекам», на якіх адбыліся сустрэчы з псіхолагамі, урачамі, супрацоўнікамі ЗАГСа і г. д.

Для дзяцей былі праведзены навагодні ранішнік «У чаканні цудаў», свята здароўя «Падарожжа ў краіну Нехварэйка», ранішнік «Азбука беражлівых» і інш.

У абласным аглядзе-конкурсе інавацыйных праектаў па арганізацыі вольнага часу моладзі дзіцячая бібліятэка з праектам «Вместе с малышом рождается мама» стала пераможцай у намінацыі «Инновации в отрасли культурно-просветительской деятельности».

За вялікую культурна-асветніцкую работу сярод насельніцтва Рашэннем Дубровенскага раённага выканаўчага камітэта ад 16 красавіка 2012 г. № 284 загадчык дзіцячай бібліятэкі Валянціна Віктараўна Усцінава занесена на раённую Дошку гонару.

З кожным годам дзейнасць бібліятэкі пашыраецца, ужо трэці год у летнім дзіцячым аздараўленчым лагеры «Лугаўцы» дзейнічае чытальная зала пад адкрытым небам. Бібліятэкары не толькі прапаноўваюць дзецям кнігі і перыядычныя выданні, але і арганізоўваюць розныя мерапрыемствы: гульнёвую праграму «Игровой полигон», поле цудаў да юбілею Я. Купалы «Сягодня з народам шчаслівым я святкую свята ўрачыстае» і інш.

Адным з накірункаў работы дзіцячай бібліятэкі з'яўляецца прапаганда камерцыйнага фонду, да якой супрацоўнікі таксама падыходзяць творча: робяць буклеты і распаўсюджваюць іх сярод вучняў школ. Распрацавана новая форма платных паслуг – «флэш-віншаванне» (мае форму тэатралізаванага прадстаўлення).

З мэтай забеспячэння чытачам доступу да інфармацыйных рэсурсаў і стварэння ў бібліятэцы камфортнага асяроддзя для зносін дзяцей у чытальнай зале з 2011 года пачаў дзейнічаць мультымедыйны цэнтр. Тэхнічнае абсталаванне яго ўключае 2 камп'ютара, шмат-

Дзіцячая бібліятэка працуе па розных накірунках: актыўна папулярызуе лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў, прывівае школьнікам любоў да роднага краю, прапагандуе сярод іх звычаі, традыцыі і вусную народную творчасць нашага народа, прапагандуе кнігі ў дапамогу прававому, патрыятычнаму, экалагічнаму, эстэтычнаму выхаванню, здароваму ладу жыцця і г. д.

Дзіцячая бібліятэка вядзе вялікую работу па супрацоўніцтве са школамі, дзіцячымі садкамі, з Інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, з раённым цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі, Домам рамёстваў, царквамі, клубам, а таксама рэдакцыяй газеты «Дняпроўская праўда».

Калектыў дзіцячай бібліятэкі (злева направа: Л. М. Радкевіч, В. В. Усцінава, В. Ю. Русанава, А. М. Цярлецкая)

У 2011 годзе на базе дзіцячай бібліятэкі быў распрацаваны праект «Вместе с малышом рождается мама», асноўнымі накірункамі якога сталі: работа з цяжарнымі жанчынамі, індывідуальная і групавая работа з дзецьмі 4-6 гадоў, супрацоўніцтва з урачамі, дзіцячымі псіхолагамі, настаўнікамі пачатковых класаў.

Праект уключыў у сябе некалькі блокаў: «Маміна бібліятэка» (камплектаванне фонду літаратурай адпаведнай тэматыкі), «Дзевяць таямнічых месяцаў» (работа з цяжарнымі жанчынамі), «Бібліяняня» (правядзенне цыкла мерапрыемстваў «Академия детства»), «Маміна школа» (стварэнне электроннага дапаможніка «Просвещенное

Сукупны фонд бібліятэк Дубровеншчыны складае 277 386 экзэмпляраў дакументаў, 67 % ад гэтай колькасці сканцэнтравана ў сельскіх бібліятэках. Летась бібліятэчныя фонды папоўніліся на 8805 экзэмпляраў. Сярод набытых кніг – энцыклапедычныя, даведачныя выданні, дзіцячая, мастацкая літаратура і інш.

Актывізавалася работа і па пошуку дадатковых крыніц фінансавання. За 2013 год шляхам выканання платных паслуг бібліятэчны бюджэт папоўніўся на 40 млн. руб. Заробленыя грошы ідуць на аснашчэнне бібліятэк, набыццё літаратуры. Бібліятэчны фонд папаўняецца і за кошт спонсарскіх сродкаў, афармлення кніг у дар ад чытачоў. З мэтай павелічэння эфектыўнасці абслугоўвання чытачоў у бібліятэках створаны камерцыйны фонд і абанемент павышанага попыту.

Прыярытэтам у развіцці бібліятэк Дубровенскага раёна з'яўляецца аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў. Гэты працэс ажыццяўляецца ў рамках дзяржаўнай палітыкі. У 2013 годзе камп'ютарны парк сістэмы налічвае 27 аўтаматызаваных месцаў. Камп'ютарызавана 15 бібліятэк, у тым ліку 13 бібліятэк аграгарадкоў. У поўным аб'ёме аўтаматызаваны бібліятэчна-бібліяграфічныя працэсы ў цэнтральнай бібліятэцы. Доступ у інтэрнэт і электронную пошту маюць 14 бібліятэк. Пры дзіцячай бібліятэцы быў створаны мультымедыйны цэнтр, які карыстаецца попытам у дзяцей і моладзі.

У цэнтральнай раённай бібліятэцы дзейнічае публічны цэнтр прававой інфармацыі, які забяспечвае даступнасць матэрыялаў заканадаўча-прававога характару для насельніцтва. Асноўны прынцып работы ПЦПІ – аператыўнасць у прадастаўленні інфармацыі.

Бібліятэка існуе не толькі для таго, каб выдаваць кнігі. Задавальняючы інфармацыйныя патрэбы наведвальнікаў, яе супрацоўнікі праводзяць сацыякультурную дзейнасць па розных накірунках. Найбольш значныя – адраджэнне нацыянальнай спадчыны, краязнаўства, патрыятычнае і экалагічнае выхаванне, арганізацыя сямейнага адпачынку. Формы правядзення мерапрыемстваў разнастайныя: пасяджэнні клубаў,

бенефісы часопісаў, гадзіны інфармацыйных паведамленняў. Цікавасць выклікаюць літаратурныя падарожжы па старонках часопісаў, выставы-агляды, прымеркаваныя да абласных падзей і знамянальных дат.

Шмат станоўчых водгукаў атрымалі мерапрыемствы: ранішнік «В гостях у феи Книги», свята журавін «Каралева балотнага царства», творчая вечарына самадзейнай паэткі І. Малчанавай «Я душу выплесну в стихах», тэматычная вечарына «Дубровеншчына: позірк праз стагоддзі», літаратурна-музычны круіз «Он людям правду под гитару говорил…» (да 75-годдзя з дня нараджэння У. Высоцкага), мітынг-рэквіем «Казарскому. Потомству в пример» і інш.

Да Дня беларускай пісьменнасці на цэнтральнай плошчы горада была праведзена экскурсійна-кніжная панарама «Бібліяград». Мерапрыемства ўяўляла сабой імправізаваны горад з вуліцамі і алеямі, на якіх размясціліся кніжныя выставы розных формаў: выстава-хобі, «жывая» выстава, выстава-сюрпрыз, выстава-віктарына, выстава мінімузей Э. Ялугіна, выстава-кафэ, выстава-імпульс і г. д. Праводзіліся агляды кожнай выставы. Гэта мерапрыемства стала сапраўдным святам для ўсіх жыхароў горада.

Сучасную бібліятэку немагчыма ўявіць без традыцыйных формаў работы: клубы па інтарэсах, аматарскія аб'яднанні – безумоўныя лідары, асабліва ў вёсцы. У бібліятэках Дубровенскага раёна дзейнічаюць 17 клубаў па інтарэсах (для дзяцей – 12, для пажылых – 3, для жанчын – 1, для моладзі –1). Званне «народны» носіць клуб аматараў садаводства, кветкаводства і агародніцтва «Субяседніца», што дзейнічае пры цэнтральнай раённай бібліятэцы.

Бібліятэкамі сістэмы распрацаваны і ўласныя мэтавыя праграмы: «Бібліятэка. Кніга. Моладзь», «Захаваем прыгажосць і здароўе роднай зямлі», «Праз кнігу – да дабра і свету», «Дарагія мае землякі», рэалізаваны праекты «Вместе с малышом рождается мама», «Азбука Берегоши», «Ішоў мой край дарогамі вайны» (да 70-годдзя вызвалення Дубровеншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў) і інш.



Тацяна Мікалаеўна Букаткіна,
намеснік дырэктара Дубровенскай
сеткі публічных бібліятэк

ДОМ ВОКНАМІ Ў ДЗЯЦІНСТВА: РАБОТА ДУБРОВЕНСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ

Дубровенская дзіцячая бібліятэка – інфармацыйны і культурны цэнтр горада, які займаецца арганізацыяй вольнага часу насельніцтва, шукае і распрацоўвае новыя формы работы і стварае спрыяльныя ўмовы для ўзаемаадносін паміж чытачамі.

Фонд бібліятэкі складае больш за 27 тысяч экзэмпляраў дакументаў. Бібліятэка выпісвае 37 найменняў расійскіх і беларускіх перыядычных выданняў. Штогод дзіцячая бібліятэка абслугоўвае больш за 2 тыс. карыстальнікаў, кнігавыдача складае звыш 32 тыс. экзэмпляраў дакументаў, колькасць наведванняў за год – амаль 16 тыс. У зону абслугоўвання дзіцячай бібліятэкі ўваходзяць дзве школы і тры дзіцячыя садкі.

У бібліятэцы працуе стабільны, з'яднаны, творчы калектыў аднадумцаў з чатырох чалавек пад кіраўніцтвам загадчыка Валянціны Віктараўны Усцінавай. Калектывам назапашаны вялікі вопыт работы з юнымі чытачамі. Разам з традыцыйнымі формамі работы тут укараняюцца новыя, сучасныя методыкі, дзякуючы якім у дзяцей фарміруецца цікавасць да кнігі.

не ради славы: Александр Иванович Казарский».

З мэтай папулярызацыі беларускай літаратуры супрацоўнікамі падрыхтавана серыя буклетаў аб беларускіх пісьменніках-юбілярах, у якую ўвайшлі выданні, прысвечаныя М. Багдановічу, М. Танку, Я. Купале, Я. Коласу, В. Дунін-Марцінкевічу, Я. Маўру, Я. Янішчыц.

Зараз работнікамі аддзела рыхтуюцца зборнік гісторыі вёсак Дубровеншчыны «Калі хочаш край свой зведаць» і зборнік гісторыі зніклых вёсак «Зніклыя старонкі Дубровенскага летапісу».

Трэба адзначыць, што аддзелам маркетынгу вядзецца вялікая краязнаўчая работа, і ў рамках праграмы «Захаваем прыгажосць і здароўе роднай прыроды» ў друкаваным і электронным варыянце падрыхтаваны эколага-краязнаўчы дапаможнік «Прыродная спадчына Дубровеншчыны».

Для павышэння кваліфікацыі і прафесійнага майстэрства бібліятэкараў ЦБС аддзелам маркетынгу праводзяцца семінары і нарады, тэмамі для якіх становяцца найбольш актуальныя пытанні. Распрацоўваюцца і праводзяцца конкурсы, якія стымулююць работу бібліятэкараў і робяць яе больш цікавай і эфектыўнай, напрыклад: агляд-конкурс на лепшы артыкул у раённай газеце «Мы ў газеце. Газета пра нас», конкурс на лепшае пасяджэнне аматарскіх клубаў «Бібліятэчны МІКС». На базе аддзела маркетынгу створана і дзейнічае школа прафесійнага росту «Прафесіянал».

Акрамя гэтага аддзел маркетынгу займаецца арганізацыяй мерапрыемстваў. На Дзень пісьменнасці на цэнтральнай плошчы горада была арганізавана экскурсійна-кніжная панарама «Бібліяград». Да Сусветнага дня паэзіі супрацоўнікамі быў арганізаваны вечар па творчасці самадзейнай паэткі Ірыны Малчанавай «Я душу выплесну в стихах».

Для папулярызацыі бібліятэчнай работы, рэкламы бібліятэчных паслуг аддзелам маркетынгу распрацаваны і праведзены акцыі «Прывядзі сябра» і «Чытаем разам».

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу – інавацыйны цэнтр бібліятэкі. Яго супрацоўнікі заўсёды глядзяць наперад, імкнуцца да развіцця і абнаўлення бібліятэчнай дзейнасці ўсяго раёна.

Усе бібліятэкі раёна – актыўныя ўдзельнікі рэспубліканскіх і абласных конкурсаў. У мінулым 2012 годзе цэнтральная раённая бібліятэка стала пераможцай абласнога тура рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ў намінацыі «За пошукавую і даследчую працу», дзіцячая бібліятэка атрымала дыплом абласнога агляду-конкурсу інавацыйных праектаў па арганізацыі вольнага часу моладзі за праект «Вместе с малышом рождается мама», Асінторфская бібліятэка – цэнтр экалагічнай асветы насельніцтва атрымала дыплом абласнога агляду-конкурсу інавацыйных праектаў па арганізацыі вольнага часу моладзі за праект «Захаваем прыгажосць і здароўе роднай зямлі» ў намінацыі «Фарміраванне экалагічнай культуры моладзі», Будская сельская бібліятэка стала пераможцай абласнога конкурсу «Інавацыі ў рабоце бібліятэк-2013» у намінацыі «сельская бібліятэка» за распрацоўку і рэалізацыю інавацыйнай комплекснай праграмы «Праз кнігу да дабра і свету».

Бібліятэкі жывуць і развіваюцца таму, што ў іх працуюць сапраўдныя прафесіяналы, якія не страчваюць цікаўнасць да сваёй работы, жадання пастаянна ўдасканальвацца ў ёй і, авалодваючы новымі тэхналогіямі, расці прафесійна, адчуваць сваю значнасць і запатрабаванасць.

Паспяховую працу бібліятэк раёна забяспечваюць 38 бібліятэкараў (9 чалавек з вышэйшай і 29 з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй). Гэта асноўны і бясцэнны скарб нашых бібліятэк.

Калектыў Дубровенскай раённай сеткі бібліятэк нямала робіць для сваіх чытачоў, але ён хоча і можа рабіць яшчэ болей. А для гэтага неабходна не толькі наша жаданне. Патрэбна ўдасканаленне матэрыяльнай базы, сучаснае тэхнічнае абсталяванне, маладыя кадры з сучаснымі ведамі, ды і месца б паболей: сёння раённай бібліятэцы з яе стваральным патэнцыялам цесна на 400 кв. м. Гэта відавочна і супрацоўнікам, і наведвальнікам. Спадзяёмся, што на самым высокім узроўні будзе разуменне месца і ролі сучаснай публічнай бібліятэкі ў інфармацыйным грамадстве.

Надзея Аляксандраўна Дударава,
метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу
Дубровенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

АДДЗЕЛ МАРКЕТЫНГУ – ЦЭНТР БІБЛІЯТЭЧНАЙ ІНАВАТЫКІ

У аддзеле бібліятэчнага маркетынгу Дубровенскай раённай сеткі бібліятэк працуюць трое супрацоўнікаў: загадчык аддзела, метадыст і мастак-афарміцель.

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу праводзіць аналітычна-даследчую дзейнасць у мэтах пошуку найбольш прымальных форм работы з чытачамі і эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў бібліятэк. Росту эфектыўнасці работы спрыяюць даследаванні, праведзеныя супрацоўнікамі аддзела: «Інфармацыйныя патрэбнасці бацькоў і дзяцей», «Чытач бібліятэкі і шляхі ўдасканалення яго абслугоўвання». Абагульняецца вопыт работы лепшых бібліятэк раёна.

Шмат увагі надаецца рэкламе бібліятэчных паслуг. Арганізуюцца выступленні бібліятэкараў у сродках масавай інфармацыі, выдаюцца буклеты і рэкламныя праспекты.

Адным з прыярытэтных накірункаў работы аддзела бібліятэчнага маркетынгу з’яўляецца павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў. Супрацоўнікі ажыццяўляюць выезды ў бібліятэкі-філіялы, пад час якіх аказваюць

метадычную і практычную дапамогу бібліятэкарам, даюць кансультацыі і парады, дапамагаюць афармляць буклеты і распрацоўваць сцэнарыі.

Аддзел маркетынгу займаецца распрацоўкай і рэалізацыяй мэтавых комплексных праграм. Бібліятэкамі ЦБС на дадзеным этапе рэалізуюцца наступныя з іх: «Бібліятэка. Кніга. Моладзь» (выхаванне інтэлектуальнай і творчай моладзі, аказанне дапамогі ў навучальным працэсе, арганізацыя вольнага часу); «Праз кнігу – да дабра і свету» (прыцягненне дзяцей да чытання); «Захаваем прыгажосць і здароўе роднай прыроды» (выхаванне любові да навакольнага свету і прыроды, беражлівых адносін да іх).

Адна з бібліятэк працуе па праекце «Азбука Берагошы», яго мэта – прывіць дашкольнікам навыкі самых простых спосабаў эканоміі на бытавым узроўні, сфарміраваць першапачатковыя прадстаўленні аб энергіі і энергарэсурсах, развіць прадстаўленні аб знешнім асяроддзі, неабходнасці і спосабах яго захавання, выхаваць навыкі культуры беражлівага энергакарыстання.

У 2012 годзе на базе сельскай бібліятэкі-музея ілёну аграгарадка Баброва работнікамі аддзела маркетынгу быў падрыхтаваны праект «Дорогие мои земляки». Бібліятэка, якая працавала па праекце, папоўніла краязнаўчы фонд каштоўнымі матэрыяламі, прыцягнула ў бібліятэку вялікую колькасць карыстальнікаў. Таксама аддзел маркетынгу прымаў удзел у распрацоўцы і рэалізацыі праекта «Вместе с малышом рождается мама», які быў накіраваны на работу з маладымі мамамі.

Аддзелам выдадзены шэраг буклетаў і дапаможнікаў, большасць з якіх краязнаўчай тэматыкі: бібліяграфічны дапаможнік, прысвечаны знакамітым землякам-спартсменам Дубровеншчыны «Спартыўная гордасць», выданне аб помніках Дубровенскага раёна «Маўклівыя сведкі вайны», зборнік сцэнарыяў краязнаўчай тэматыкі «Аб тым, чым сэрца даражыць», біябібліяграфічны паказальнік, прысвечаны воінам-інтэрнацыяналістам «Войной истерзанные души», буклеты «Кляштар бернардзінцаў: нямы сведка гісторыі», «Цудадзейная крыніца», «Подвиг